*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 10 (223) | Нядзеля, 1 Мая 1955 года | Цана 20 кап.

**Няхай жыве 1 Мая—дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, дзень брацтва рабочых усіх краін!**

**Вышэй сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізма! Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!**

**Брацкае прывітанне ўсім народам, якія змагаюцца за мір, за дэмакратыю, за соцыялізм!**

*(З заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1955 года).*

## СВЯТА ВЯСНЫ І МАЛАДОСЦІ

Мільёны простых людзей, якія жывуць пад рознымі шыротамі, на розных кантынентах, выходзяць сёння на вуліцы, каб яшчэ раз прадэманстраваць адзінства сваіх радоў, сваю непахісную рашучасць упарта змагацца за шчасце працоўнага люду. На алых палотнішчах і транспарантах, на многіх мовах будзе выведзена слова «Мір». Міру патрабуюць усе людзі добрай волі.

У авангардзе перадавых змагароў за мір ва ўсім свеце ідзе Савецкі Саюз, паказваючы шлях да новага, шчаслівага жыцця. Савецкі народ адзначае гэты дзень новымі поспехамі на ўсіх участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Радасна б'ецца сэрца пры думцы аб тым, што зроблена савецкім чалавекам за апошнія гады. Непазнавальна змяняецца воблік нашай Радзімы. Растуць гарады і вёскі, заводы, шахты, электрастанцыі, узнімаюцца мільёны гектараў цалінных земляў, ствараюцца новыя моры, арашаюцца пустыні і засушлівыя стэпы.

На базе росту народнай гаспадаркі дасягнуты значныя поспехі ў справе далейшага ўздыму матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця нашага народа. Рашэнні партыі і ўрада намецілі новую праграму далейшага развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

У вялікай працы па пераўтварэнню ў жыццё планаў, намечаных партыяй і ўрадам, вялікую ролю заклікана адыграць савецкая навука. «Работнікі навукова-даследчых устаноў і вышэйшых навучальных устаноў! Рухайце ўперад савецкую навуку і тэхніку! Смялей разгортвайце крытыку недахопаў у навуковай рабоце! Павышайце ролю савецкай навукі ў развіцці народнай гаспадаркі і забеспячэнні тэхнічнага прагрэсу нашай краіны! Паляпшайце падрыхтоўку спецыялістаў!»—заклікае Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Гэты заклік будзе прыняты нашымі вучонымі, як баявая праграма далейшай дзейнасці на карысць сваёй Айчыны. Ён абавязвае навуковых работнікаў нашага універсітэта лепш і больш інтэнсіўна распрацоўваць навуковыя праблемы, неабходныя для камуністычнага будаўніцтва, каб новымі навуковымі працамі ўнесці ўклад у агульную барацьбу савецкага народа за сваё вялікае будучае.

У першых радах будаўнікоў камунізма побач са старэйшымі таварышамі крочыць моладзь, слаўныя камсамольцы—верныя памочнікі Камуністычнай партыі. Сваёй самаадданай працай, уменнем перамагчы ўсе цяжкасці і дабіцца перамогі Ленінскі Камсамол заслужыў любоў і павагу ўсяго савецкага народа. Авалоданне ведамі стала жыццёвай патрэбай савецкай моладзі. Першамайскае свята студэнты Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна адзначаюць новымі поспехамі ў вучобе.

Набліжаецца летняя экзаменацыйная сесія. Перад намі стаіць задача—правесці яе на высокім узроўні, дабіцца таго, каб дрэнных і здавальняючых адзнак не было ў экзаменацыйных ведамасцях.

У светлы дзень Першамая Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза звяртаецца з заклікам да нашай моладзі: «Юнакі і дзяўчаты, наша слаўная савецкая моладзь! Больш актыўна ўдзельнічайце ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве, ва ўсім грамадска-палітычным жыцці краіны! Настойліва вывучайце дасягненні перадавой навукі і тэхнікі, авалодвайце ведамі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці! Будзьце стойкімі і смелымі ў барацьбе за перамогу вялікай справы камунізма ў нашай краіне!».

Будзем-жа такімі, якімі нас заклікае быць партыя!

Александр **ОРШАНЕЦ**

### МАЙ

Май пришел,
Красив и наряден,
В ярком солнце,
В цветах весны.
Расчесал
Шелковистые пряди
Пышных озимей,
Крон лесных;

Чуть провел
Незримою кистью—
Белизной
Оделись сады,
Реки —
Россыпью серебристой,
Алой кромкой —
Маков цветы.

И, собрав
Воедино эти
Краски Родины
И весны,
Брызнул Май их
На щёки детям,
Как подарок
Родной страны.




### УТРО ПЕРВОМАЙСКОЕ

По-над липами и клёнами,
Расплескав зари восход,
Первомай, шумя знамёнами,
Над страной моей встаёт.
И в лучах его красавицей,
Сея счастья семена,
Мирным людям улыбается
Белорусская весна.
Пробуждаются алтайские
И сибирские края.
Здравствуй, утро
первомайское!
Здравствуй, Родина моя!

Леонид **МИРОНЧИКОВ.**

## ВЯДОМЫ ВУЧОНЫ-БІЁЛАГ

Амаль усе выкладчыкі, аспіранты і студэнты біёлага-глебавага факультэта былі на абароне доктарскай дысертацыі «Млекакормячыя Беларускай ССР і іх гаспадарчае значэнне» адным са старэйшых выкладчыкаў факультэта Іванам Нікалаевічам Сержаніным.

Асаблівае хваляванне і ўрачыстасць гэтай абароны былі выкліканы не толькі тым, што І. Н. Сержанін адзін з лепшых выкладчыкаў факультэта, але і тым, што гэта першая доктарская дысертацыя выхаванца біёлага-глебавага факультэта.

Цяжкі, але цікавы шлях прайшоў Іван Нікалаевіч—ад простага вясковага настаўніка да аднаго з буйнейшых вучоных-біёлагаў нашай рэспублікі.

Скончыўшы ў 1926 годзе універсітэт, ён едзе працаваць у Любанскую вясковую школу. Любоў да навукі, імкненне да ведаў заўсёды характарызавалі І. Н. Сержаніна. Ужо ў 1930 годзе ён паступае ў аспірантуру Інстытута заалогіі Акадэміі навук СССР у Ленінградзе. Паспяхова закончыўшы аспірантуру, Сержанін пачынае ў 1933 годзе вялікую выкладчыцкую і навуковую дзейнасць на біялагічным факультэце нашага універсітэта. Вялікая штодзённая напружаная праца вучонага робіцца з гэтага часу яго асноўным заняткам.

Больш 25 год свайго жыцця І. Н. Сержанін прысвяціў вывучэнню жывёльнага свету Беларусі. Цікавасць да даследавання жывёльнага свету БССР выклікалася тым, што на працягу некалькіх стагоддзяў беларускія пушчы славіліся багаццем капытных і пушнога звера. Тут знаходзіліся апошнія сховішчы еўрапейскага стада зубраў, лясных коней, яшчэ ў XVIII стагоддзі тут вадзіўся собаль.

На падставе шматгадовых асабістых назіранняў Іван Нікалаевіч зрабіў цікавыя вывады і даў грунтоўныя апісанні вобразу жыцця і размнажэння звяроў у Беларусі. Гэтыя назіранні былі абагульнены ў шматлікіх работах, якія маюць вялікае навуковае і практычнае значэнне.

Каштоўны ўклад зрабіў І. Н. Сержанін шматлікімі зборамі цікавых відаў жывёл у наш заалагічны музей.

Вынікам гэтай доўгай, настойлівай працы і з'явілася доктарская дысертацыя Івана Нікалаевіча. Работа заснавана на камеральных і палявых даследаваннях у розных раёнах рэспублікі. Аўтар вывучыў даволі шырокую калекцыю млекакормячых, якая налічвае звыш 3 тысяч экземпляраў. І. Н. Сержаніну ўдалося выявіць заканамернасці распаўсюджвання млекакормячых у розных прыродных умовах Беларусі і тым самым указаць, у якім кірунку і якім чынам трэба выкарыстоўваць наяўнасць гэтых жывёл.

Вывучыўшы дадзеныя заалагічнай і геаграфічнай літаратуры ў летапісах і старажытных актах, І. Н. Сержанін характарызуе змены, якія перанесла фауна млекакормячых у гістарычныя часы

Вялікую і плённую працу Іван Нікалаевіч спалучае з шматграннай выхаваўчай і арганізацыйнай работай. Чулы таварыш, добры лектар, уважлівы навуковы кіраўнік—такім ведаюць яго студэнты нашага факультэта. Пад яго кіраўніцтвам паспяхова абаронены тры кандыдацкіх дысертацыі, чатыры аспіранты працуюць над дысертацыйнымі тэмамі.

Сваёй нястомнай, плённай працай І. Н. Сержанін зрабіў вялікі ўклад у заалагічную навуку, у справу падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

**Рэдакцыя бюлетэня СНТ біёлага-глебавага факультэта.**

## ПАДАРУНАК ЮБІЛЯРУ

Да двухсотгоддзя Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава дацэнт нашага універсітэта Н. Е. Рагозін падарыў юбіляру рэдкую кнігу: «Дарожная геаграфія, якая змяшчае апісанне аб усіх ў свеце дзяржавах, аб іх клімаце, норавах і звычаях жыхароў, сталічных гарадах, іх адлегласцях ад Парыжа і аб вядучых да гэтага горада дарогах як морам, так і сухім шляхам» (пераклад з французскай мовы), выдадзеную пры Імператарскім Маскоўскім універсітэце ў 1765 годзе.

Рэктар Маскоўскага універсітэта акадэмік т. Пятроўскі ад імя калектыву універсітэта прыслаў т. Рагозіну пісьмо з падзякай за каштоўны падарунак.

Кніга будзе захоўвацца ў бібліятэцы Маскоўскага універсітэта.

А. ХАРКЕВИЧ

## С комсомольской путёвкой

Ту весну с благодарностью
Вспомнят потомки,
Хоть секли её злая
Позёмка и дождь,—
Той весной, получивши
В райкоме путёвки
Уезжала по зову
ЦК молодёжь.
Сизый дым завивая
В волнистые кольца,
Паровозы гудками
Будили страну:
Отправлялись в далёкий
Поход комсомольцы
Поднимать необжитых
Земель целину.
Там, где пахоты чёрной
Край непочатый,
Где веками дремали
В степях ковыли,
Пробудили простор
Пареньки и девчата
Звонкой песней,
Что вместе с собой привезли.
Привезли они в степи
Уверенность в силе,
Молодые сердца,
Комсомольский запал,
Голубые мечты
И орлиные крылья,
И великие души,
Как чистый кристалл.
Приглядевшись внимательней
К этим ребятам,
Вы за внешним различьем
Найдёте черты,
Что присущи для каждого,
Вместе роднят их,
Как на дереве—листья,
Как в парке—цветы.
Это—Павки Корчагина
Правое дело,
Это—Зои,
Нацеленный в ката,
Зрачок,
Это—славный таран
Николая Гастелло,
Это—Саши Матросова
В вечность бросок!
Да, с такими людьми
Разговаривать много
Не надо:
Не впервой им вершить
Боевые дела.
Их отцом
Был восставший
Народ Петрограда,
Мать—
Советская Родина—
Их родила!
Там, где самый ответственный
Выпал участок,
Где другой бы попятился
Или от страха
Замолк,
Выходил победителем
Тысячи раз ты,
Обессмертив своих сыновей,
Комсомол!
И с отцовскою хваткой,
С горячей душой
нараспашку,
С комсомольской путёвкой
У сердца,—
Чтоб сердце будила она,—
Провели они
Первую в жизни
Алтайскую вспашку—
Зарунела пшеницею
Поднятая
целина.

К. ЦВІРКА

## *Па роднаму краю*

**Пясок жаўтаваты кладзецца пад ногі—
Іду па зямлі я... Дарогі, дарогі.
Я вольны сягоння: прайшлі ўжо залікі,
І лета маё—час студэнцкіх канікул.
Хто ў дом адпачынку, хто проста дадому—
На лета паехалі хлопцы, вядома.
А я вышаў ранкам з адзіным намерам
Маёй Беларусі дарогі памераць.
З турысцкай пуцёўкай сышоў я з парогу.
Мяшок за плячыма... Дарогі, дарогі.
Радзіма мая—пералескі, даліны;
Раса на трыпутніку паўз каляіны;
Зялёны шчэ колас над шляхам звісае;
Дарога ў калоссі густым прападае.
І ў жытнім разліве са станам пахілым
Старая бяроза галіны ўтапіла.
А з сіняга неба—струменьчык срабрысты:
Звініць над палямі жаўрук галасісты.
З-за далечы пырснула сонца праменнем.
Дзень будзе лагодным. Звужаюцца цені.
Ісці мне і йсці: Беларусь немалая
А там ля кастра заначую ля гаю.
А там я світанкам ля веццяя густога
Ізноў. паднімуся... Дарогі, дарогі.
Каўнер мой—уросхліст. Мятровыя—крокі,
Чупрына на ветру раскідана злёгку.
І ногі-б пылілі па ўзгорках без ліку—
Кідай толькі сцежкі мне пад чаравікі.
Іду і іду я, глытаючы вецер,
І ў думках рашаю: як добра на свеце!**

## СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА

Бяроза прыдарожная,
Зялёныя лугі...
Гляджу, як заварожаны,
На край мой дарагі.
Бялеюцца за вёскаю
Мяцеліцай сады.
Эх, сэрца комсамольскае,
Эх, юныя гады!
Бяроза прыдарожная,
Забудзь растання сум,
Адну цябе, прыгожая,
Я ў сэрцы панясу.
Калі-ж парой грымотнаю
Я не прыду з пуці,
Істужкі з пазалотаю
Пад восень запляці.
Успомні, як часінаю
Я тут бываў адзін,
Як з любаю дзяўчынаю
Пад твой шацёр хадзіў.
І, думамі ўстрывожаны,
Пра ўсё сказаць не мог...
Бяроза прыдарожная,
У свеце шмат дарог.
Ды самая найлепшая
У родны край вядзе.
Сяброўка мая першая,
Чакай сустрэчы дзень.

* * *

Цудоўнае лета—
Пара маладая!
Але-ж не пра гэта
Я гутарку маю.
Мы лепей гасцямі
Давайце пабудзем
Між выпускнікамі
У інстытуце.
Сапраўднае лета
Мы тут з вамі ўбачым
У сэрцах студэнтаў,
На тварах юначых.
Свой след назаўсёды
Яно тут паклала,
Нібы і само тут
Дыплом атрымала.
Тут жарты і спрэчкі—
Хто ў вёску, хто ў горад—
Да хуткай сустрэчы!
Сустрэнемся-ж скора.
І прымаўку з месца
Тут хтосьці складае:
Што там зараз кепска,
Дзе нас не хапае!

* * *

Час прышоў, і, так сказаць,
Трэба разлучыцца:
Жонка едзе працаваць,
Мужу—год вучыцца.
Год разлукі, і ў наказ
Жонка кажа гэтак:
Добра чысці керагаз,
Сам вары абеды;
Сумна будзе мне ў глушы—
Еду за поўсвета:
Кожны дзень лісты пішы
І пішы канспекты.
У тэатры не хадзі,
Лекцыі ўсе слухай,
Не куры ты і, глядзі,
Чарачкі не нюхай...
—Добра,—муж ёй адказаў,—
Толькі глянуў хмура:
Пэўна хочаш, каб папаў
Я ў аспірантуру.

Ул. НЯДЗВЕДСКІ.

# *НАШЫ ЛЕПШЫЯ*

★ ★

## НАСТОЙЛІВАЯ ПРАЦА



Валянцін Міхалковіч прышоў ва універсітэт са срэбным медалем. Гэтую высокую ўзнагароду ён апраўдаў, здаўшы першую сваю экзаменацыйную сесію толькі на «выдатна». Цяпер Валянцін разлічыўся з унеаўдыторным чытаннем, здаў залік па марфалогіі раслін, добра падрыхтаваўся да летняй экзаменацыйнай сесіі, якая ў нас пачынаецца ў бліжэйшыя дні. Поспехі Міхалковіча не з'яўляюцца выпадковымі: ён канспектуе ўсе лекцыі, чытае многа літаратуры, старанна рыхтуецца да семінараў і практычных заняткаў, умела плануе свой рабочы час.

Круг інтарэсаў Валянціна не абмяжоўваецца толькі вучобай. Ён з'яўляецца агітатарам на «Аўтапрамбудзе», удзельнічае ў рабоце гуртка гідрабіялогіі. На нашых курсавых вечарах Міхалковіч паспяхова чытае вершы Канстанціна Сіманава. Добрых вынікаў дабіўся Валянцін і ў секцыі фехтавання, якую ён рэгулярна наведвае. Мы часта бачым яго за чытаннем навінак мастацкай літаратуры, сустракаем у кіно і тэатрах. Аднакурснікі вераць, што Міхалковіч стане добрым спецыялістам сваёй справы.

**Л. МАІСЕЕНКА,**
**студэнтка I курса аддзялення біялогіі.**

## ГОРДАСЦЬ ФАКУЛЬТЭТА



З новымі поспехамі ў вучобе сустрэў Першамай студэнт IV курса хімічнага факультэта Міхаіл Гілевіч. Нядаўна ён, як заўсёды, на «выдатна» здаў экзамены па палітычнай эканоміі і неарганічнаму сінтэзу.

Паспяхова закончыў Міхаіл і сваё навуковае даследаванне. Ён вывучаў пытанне аб акісленні цэлюлёзы вокісламі азота. Гэта дало магчымасць выявіць некаторыя бакі атрымання новага таннага крывестрымліваючага сродка. Аб выніках сваёй работы Гілевіч расказаў на студэнцкай навуковай канферэнцыі Вільнюскага універсітэта.

Гілевіч спалучае выдатную вучобу з абавязкамі старшыні профбюро факультэта.

За поспехі ў вучобе і грамадскай рабоце Міхаілу назначана персанальная стыпендыя імя 15-годдзя ВЛКСМ.

**Г. ВАСКАБОЙНІКАВА.**

## ВЫДАТНІЦА ВУЧОБЫ



Пасля працоўнага дня ў дзесяты пакой інтэрната па вуліцы Свердлова збіраюцца яго жыхары: Зоя Мілановіч, Зіна Солтан, Ніна Башаркова і Надзежда Табачко. Прыемна пасля напружаных заняткаў адпачыць ва ўтульнай абстаноўцы, пагаварыць аб прачытаных кнігах, аб музыцы, памарыць аб сваёй прафесіі. І заўсёды неяк выходзіць, што ў цэнтры ўвагі аказваецца Зіна Солтан. Яна вельмі любіць і ведае опернае мастацтва, можа гадзінамі расказваць аб сваім любімым кампазітары Чайкоўскім або з натхненнем уголас чытаць творы Шэўчэнкі, Тургенева ці Караленкі, абмяркоўваць творы Максіма Горкага, вышыты партрэт каторага вісіць над ложкам Зіны.

Мы займаемся разам з Зінай ужо чацверты год. І за гэты час усе палюбілі гэтую сціплую, працалюбівую дзяўчыну. Яна ўвесь час вучыцца толькі на «выдатна», дапамагае другім. Напярэдадні Першага мая яна здала кіраўніку А. Ф. Манаенкавай вельмі цікавую курсавую работу, у якой аналізуецца лексіка рускага говара адной з вёсак Гомельскай вобласці. Над гэтай тэмай Зіна будзе працаваць і на V курсе. Зіна актыўна выконвае і розныя грамадскія даручэнні. Яна член савета СНТ факультэта, удзельнік мастацкай самадзейнасці універсітэта. За ўсё гэта аднакурснікі вельмі любяць і паважаюць Зіну.

**Л. ШРУБОК,**
**студэнтка IV курса аддзялення рускай мовы і літаратуры.**

## НАПЯРЭДАДНІ ЭКЗАМЕНАЎ

Не за гарамі летняя экзаменацыйная сесія. Хутка студэнты і прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта пачнуць падводзіць вынікі сваёй сумеснай працы за год.

Па рускай совецкай літаратуры ў летнюю экзаменацыйную сесію будуць трымаць экзамены студэнты II курса гістарычнага факультэта і IV курса аддзялення журналістыкі. Студэнты IV курса аддзялення рускай літаратуры і мовы павінны здаць экзамены па спецкурсу (творчасць Маякоўскага), спецсемінару і г. д.

Асабліва адказныя экзамены па совецкай літаратуры будуць у студэнтаў IV курса аддзялення журналістыкі. Гэта тлумачыцца тым, што на гэтым аддзяленні курс рускай совецкай літаратуры зараз вывучаецца ў такім значным аб'ёме—замест 68 гадзін, якія адводзіліся раней, ужо другі год чытаецца 108.

У мэтах кантролю за самастойнай працай студэнтаў і накіравання іх работы па падрыхтоўцы адпаведных дысцыплін, у сакавіку—красавіку гэтага года былі праведзены індывідуальна-групавыя калёквіумы па частцы курса совецкай літаратуры са студэнтамі IV курса аддзялення журналістыкі і семінарскія заняткі па спецкурсу са студэнтамі IV курса аддзялення рускай літаратуры і мовы.

Калёквіумы паказалі, што асноўная маса студэнтаў сур'ёзна адносіцца да сваёй вучобы і сістэматычна працуе над засваеннем адпаведнага праграмнага матэрыялу. Да такіх адносяцца студэнты IV курса аддзялення журналістыкі: Варчэня, Уружнікава, Крачкоўская, Алфімава і другія; студэнты IV курса аддзялення рускай літаратуры і мовы Міласлаўская, Рэутовіч, Церашонак і другія. Станоўча трэба таксама адзначыць работу студэнтаў-журналістаў чацвертага курса Мальдзіса, Нікіфаравай, Харкевіча і другіх.

Але некаторыя студэнты, відаць, спадзяюцца на рускае «авось». Яны амаль зусім самастойна не працуюць над вывучэннем прадугледжанага праграмай матэрыялу. Так, студэнты IV курса аддзялення журналістыкі Глебка, Зубараў, Коршукаў і некаторыя другія не ведаюць тэкстаў раду асноўных твораў М. Горкага, В. Маякоўскага, А. Талстога, М. Шолахава і другіх пісьменнікаў.

Неабходна памятаць, што экзамены—гэта вынік работы не толькі ў экзаменацыйную сесію, а ўсёй працы за год. Таму студэнтам, якім было ўказана на недахопы ў іх самастойнай працы, неабходна неадкладна перабудавацца і засесці па-сур'ёзнаму за работу.

Як рыхтавацца да экзаменаў па рускай совецкай літаратуры?

Асноўныя веды студэнты набываюць як у працэсе слухання лекцый, так і ў працэсе сістэматычнай самастойнай працы. Таму неабходна звярнуць сур'ёзную ўвагу на вывучэнне прадугледжаных праграмай дакументаў аб літаратуры. Рэкамендуецца вывучаць паралельна тэксты твораў і адпаведны лекцыйны матэрыял. Пры гэтай умове ў студэнтаў будуць складвацца цэласныя веды па таму або іншаму раздзелу літаратуры. Ва ўсіх выпадках, калі ўзнікаюць тыя або іншыя незразумелыя пытанні, трэба неадкладна атрымоўваць кансультацыю ў выкладчыка.

Калі студэнты прыкладуць неабходныя намаганні, то безумоўна яны ўсе змогуць паспяхова здаць экзамены. Выкладчыкі з свайго боку акажуць студэнтам усялякую дапамогу ў засваенні імі адпаведных дысцыплін. Але пры гэтым трэба памятаць, што поспех перш за ўсё залежыць ад кожнага студэнта паасобку, ад таго, наколькі ён упарта будзе працаваць над засваеннем адпаведнага курса.

**А. СТОРАЖАЎ,**
**дацэнт.**

## У ЛАБАРАТОРЫЯХ УНІВЕРСІТЭТА

Кожны дзень запаўняюць студэнты універсітэцкія лабараторыі. Тут яны практычна замацоўваюць праграмны матэрыял, самастойна распрацоўваюць складаныя пытанні, звязаныя з удасканаленнем вытворчых працэсаў на заводах нашай рэспублікі.

**Студэнты чацвертага курса аддзялення фізікі З. Манько, І. Русецкі і др. не толькі паспяхова замацоўваюць тэарэтычны матэрыял, але і вышукваюць новыя шляхі для паляпшэння якасці і паніжэння сабекошту прадукцыі, якая выпускаецца прамысловымі прадпрыемствамі гор. Мінска.**





**На здымках:** Выпускнік **М. Шэлег** у лабараторыі электрафізікі вызначае тэрмаэлектрычную сілу сплаву алюмінія з сурмой (здымак зверху).

Студэнт аддзялення фізікі **В. Грыбкоўскі** вывучае законы затухання алюміністыруючых рэчываў (здымак пасярэдзіне).

Студэнткі 1-га курса хімфака **М. Белакурская** і **З. Шчарбакова** практыкуюцца ў атрыманні соды аміячным спосабам (здымак першы знізу). **Інга Кірычэнка** і **Ядзя Катуша** вывучаюць асаблівасці вуглярода (здымак другі знізу).

Фота **Л. БОНДАРА**,
тэкст **В. ЧАРГЕЙКІ.**





## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА СТУДЭНТАЎ

**(ПА СТАРОНКАХ СТУДЭНЦКІХ ЧАСОПІСАЎ)**

На працягу многіх вякоў людзі марылі аб свабодзе.

Зараз студэнты, якія жывуць у каланіяльных і залежных краінах, прагнуць незалежнасці і змагаюцца за яе, каб іх радзіма магла свабодна развівацца ў эканамічных, соцыяльных, культурных і палітычных адносінах.

З кожным годам расце падтрымка, якую аказваюць студэнты ўсяго свету сваім калегам у каланіяльных і залежных краінах. Студэнты краін-метраполій усё ясней усведамляюць, што прыгнёт іншых народаў нясе пагрозу бяспецы ўласных краін і міру ва ўсім свеце.

Многія пакаленні студэнтаў мужна змагаліся за свабоду. Прыкладам таму можа служыць гераічная самаадданая барацьба студэнтаў супроць фашызма ў час другой сусветнай вайны. Гэта пацвердзілі і падзеі апошніх гадоў.

Так, студэнты **Індыі** адыгралі вялікую ролю ў тым, што іх краіна змагла заняць сваё законнае месца сярод нацый свету. Свой уклад у барацьбу за дасягненне незалежнасці радзімы ўнеслі студэнты **В'етнама.** У **Інданезіі** і **Бірме** студэнты дабіліся значных магчымасцей для развіцця нацыянальнай культуры. Змены, якія мелі месца ў пазбаўленым ад іншаземнага ўладарніцтва **Кітаі,** у значнай ступені абавязаны развіццю студэнцкага руху ў гэтай вялікай краіне.

У розных дзяржавах розныя і ўмовы жыцця студэнтаў. Дзейнасць студэнтаў таксама мае многія формы. Нядаўна на ўвесь свет прагучэла патрабаванне студэнтаў **Кіпра** і **Грэцыі** аб уз'еднанні гэтых краін. У студэнцкіх дэманстрацыях у Афінах прымала ўдзел каля 4000—5000 чалавек. Паліцыя кінулася на дэманстрантаў з дубінкамі, у ход былі пушчаны пажарныя брандспойты. Але праз два дні ў Салоніках зноў некалькі тысяч студэнтаў вышлі на дэманстрацыю.

Студэнты **Гватэмалы** і **Пуэрто-Рыко** неаднаразова ўзнімалі голас пратэсту супроць іншаземнага засілля. Іх пратэст быў падтрыман усімі студэнтамі Лацінскай Амерыкі. Усеагульны саюз студэнтаў **Ірака** і саюз студэнтаў **Тэгеранскага універсітэта** ў вельмі складаных умовах змагаюцца за поўную нацыянальную незалежнасць сваіх краін. Усеяпонская канферэнцыя студэнтак у сваім звароце пісала: «Зараз мы, студэнткі Японіі, адзінадушна ўзняліся на барацьбу; ...прыкладзем усе намаганні, каб пазбавіцца ад соцыяльнай несправядлівасці, каб наша жыццё стала лепшым. Мы будзем змагацца супроць пераўзбраення нашай краіны, каб жыць у дружбе з другімі народамі, больш актыўна супрацоўнічаць у барацьбе за ўмацаванне міру ва ўсім свеце.

Асацыяцыя студэнтаў-мусульман **Паўночнай Афрыкі,** студэнты **Нігерыі** і **Французскай Чорнай Афрыкі** патрабуюць ухіліць перашкоды, якія стаяць на шляху ажыццяўлення нацыянальных імкненняў і наладжванню міжнародных сувязей.

Асабліва трэба адзначыць поспехі студэнцкага руху ў **Малайі.** У сучасны момант Малайя з'яўляецца паліцэйскай дзяржавай. Жорсткія законы, якія дзейнічаюць у краіне, ушчэмліваюць усе грамадзянскія правы і дэмакратычныя свабоды насельніцтва. Барацьба за асноўныя дэмакратычныя свободы і правы чалавека знаходзяць гарачую падтрымку сярод студэнтаў. Яны выступаюць з патрабаваннямі акадэмічных свабод ва універсітэце і неўмяшальніцтва ўрада ў справы студэнтаў. Улады канфіскавалі студэнцкія газеты і абвінавацілі рэдактараў гэтых газет у падбухторванні да бунту. Усемалайская федэрацыя студэнтаў імкнецца да пашырэння сувязяў з другімі нацыянальнымі міжнароднымі студэнцкімі арганізацыямі. Федэрацыя выступае таксама з патрабаваннямі прызнання малайскай мовы нацыянальнай і ўстанаўлення поўнай нацыянальнай незалежнасці сваёй краіны. Члены ўсемалайскай федэрацыі студэнтаў яскрава ўсведамляюць, што прадпасылкай для ажыццяўлення гэтых патрабаванняў служыць арганізацыя і аб'еднанне студэнтаў. Нацыянальнае адзінства і, у прыватнасці, адзінства студэнтаў з'яўляецца надзейнай асновай будучай нацыі.

У **Судане** нацыянальны саюз студэнтаў дапамагае свайму народу авалодаць асновамі ведаў. Адна з найбольш актыўных арганізацый студэнтаў, якія вучацца за мяжой, Саюз студэнтаў Заходняй Афрыкі, нягледзячы на прынятыя нядаўна адміністрацыйныя меры, працягвае змагацца за адраджэнне і папулярызацыю афрыканскай культуры.

Мэты і дзейнасць студэнтаў розных каланіяльных і слаба развітых краін цесна звязаны паміж сабою. Рост дасягненняў гэтых краін у галіне культуры гаворыць аб іх імкненні да такой сістэмы асветы, якая адпавядала-б нацыянальным, гістарычным і культурным традыцыям іх народаў. Студэнты змагаюцца за развіццё нацыянальнай мовы і выкарыстанне яе для развіцця нацыянальнай культуры, за стварэнне і пашырэнне цэнтраў вышэйшай асветы, за ліквідацыю непісьменнасці сярод насельніцтва сваіх краін. Гэтая пашыраная дзейнасць сустракае падтрымку міжнароднага саюза студэнтаў, які з'яўляецца сапраўднай міжнароднай студэнцкай арганізацыяй.

21 лютага 1955 года МСС, які заўсёды прызнаваў права студэнцкіх арганізацый калоній прадстаўляць студэнтаў сваіх краін у розных міжнародных аб'еднаннях, яшчэ раз падкрэсліў, што адным з асноўных прынцыпаў яго дзейнасці з'яўляецца падтрымка любога руху студэнтаў за поўную нацыянальную незалежнасць і лепшае жыццё.

МСС заклікае студэнтаў і іх арганізацыі ўсімі сродкамі садзейнічаць дасягненню гэтых мэт у духу міжнароднага супрацоўніцтва. Міжнародны саюз студэнтаў паказаў нам прыклад такога супрацоўніцтва ў сваёй дзейнасці мінулага года. Пабудова санаторыя ў Пекіне для студэнтаў краін Азіі; дапамога студэнтам, якія пацярпелі ад паводак у Пакістане і ад землетрасення ў Алжыры; стыпендыі Міжнароднага саюза студэнтаў; выданні, якія расказваюць праўду аб жыцці і барацьбе студэнтаў каланіяльных і залежных краін,—вось дзеянні, якімі можна падтрымаць і наблізіць дзень, калі кожны студэнт будзе займацца ў сваёй роднай краіне, незалежнай і свабоднай.

**Т. КРАЧКОЎСКАЯ.**

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 01284 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыраж 1000 экз. Зак. 254.